Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 18 Вільня, Нядзеля 8 Траўня 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

І каталікі і праваслаўныя.

(Да ідэолёгіі БХД).

У склад БХД ўваходзяць беларусы, як каталікі, так і праваслаўныя. Гэта і зразумела! Народ беларускі належа да дзьвёх хрысьціянскіх вераў—праваслаўнай і каталіцкай, дык і сябры розных беларускіх арганізацыяў, як культурных, грамадзкіх, так і палітычных — гэта беларусы каталікі і беларусы праваслаўныя. Так ёсьць сапраўды і з БХД.

Адная часта можна спаткацца з увагай, што БХД гэта выключна арганізацыя беларусаў-каталікоў. Гэткая ўвага часта паходзіць ад тых людзей, якія самі дасканальна ведаюць, што з БХД так ня ёсьць, аднак-жа гавораць і пішуць праціўнае. Мусіць ёсьць нейкія прычыны гэтага зьявішча.

Вось-жа прычыны гэтага ёсьць і яны паходзяць сьведама ці нясьведама ад ворагаў беларускага народу.

Выключна на каталік ў хрысьціянць БХД расейцы розных палітычных кірункаў. Робяць яны гэта, каб, надаўшы БХД характар выключна каталіцкі, рэлігійны, звузіць у вачах нашага народу яе дзейнасьць і адцягнуць ад яе нашы праваслаўныя сялянскія масы, што шукаюць развязкі пытаньняў можа менш рэлігійных, а прадусім сацыяльных і народных. Гэтак адносна нас паступаюць, як расейцы бальшавікі, так — што бачым у апошнім „Голасе Прав. Беларуса" — і расейцы нацыяналісты.

Тое-ж самае адносна БХД спатыкаем і з боку польскага. Клясычным прыкладам тут зьяўляецца некалькі гадоў таму выступленьне проціў БХД віленскага польскага р.-к. арцыбіскупа Ялбжыкоўскага. Арцыбіскуп гэты, як ведаем, на тэй падставе,што БХД—паводле яго — арганізацыя выключна каталіцкая, рэлігійная,а тымчасам паступае інакш, бо між іншым прыймае да сябе і беларусаў праваслаўных, публічна яе зганіў, як некаталіцкую і забараніў каталіком да яе належаць і чытаць яе орган „Беларускую Крыніцу". Мэта ясная: аслабіць БХД, адцягваючы ад яе каталікоў, кіруючы іх у бок польскі, а так-жа адстрашваючы ад тэй-жа БХД бел. праваслаўных, выказваючы, што арганізацыя гэта ўсё-ж-дыкі каталіцкая, толькі з малымі пахібамі.

У сэнсе хрышчэньня БХД на каталіцкую выключна адзначаецца так-жа „Бел. Звон", які выходзіць у Вільні і які, як ведама, арэнтуецца на Польшч. Прычыны, чаму гэты „Бел. Звон", прадстаўляе нас сьведама (бо ён-жа ня можа аб нас ня ведаць праўды) у фальшывым сьвятле, ведамыя. У гэтым мы бачым, між іншым так-жа і адгалосак, можа нясьведамы, польскай яго ор'ентацыі.

Ясна, што гэткае дзяленьне і застрашваньне беларусаў праваслаўных каталікамі, а беларусаў каталікоў-праваслаўнымі паходзіць толькі з боку ворагаў нашага народу і на выразную шкоду гэтага народу. Не дзяліцца мы павінны, а лучыцца. Рэлігійная грызьня і рэлігійнае цкаваньне адкінуць мы павінны ад сябе як найдалей і назаўсёды. Мы павінны ведаць, што ўсё рэлігійнае нацкоўваньне беларусаў на беларусаў— гэта дальшы цяг расейска-польскай спэкуляцыі на беларускім народзе.

Вось-жа з гэтага ўсё добра ацэньвае БХД і адпаведна вядзе сваю працу. Да БХД належаць бяз розьніцы як каталікі, так і праваслаўныя, бо гэткім ёсьць народ беларускі.

БХД ня ёсьць выключна ані каталіцкай, ані праваслаўнай. БХД гэта беларуская грамадзка-палітычная, стаячая на грунце хрысьціянскага сьветапагляду, арганізацыя беларусаў каталікоў і беларусаў праваслаўных, якія ў справах сьцісла рэлігійных маюць поўную аўтаномію.

Дзеля гэтага БХД у сваёй праграме, дзе формулуе свае адносіны да Царквы і Касьцёла, ня р біць у жыцьці грамадзка-палітычным між імі розьніцы і трактуе іх пароўні (Праграма і Статут Бел. Хр. Дэм. прынята на зьезьдзе 6.XI.27 Раздз. IX. Рэлігія.).

Так-жа дзеля гэтага БХД у свае арганізацыйныя ўлады выбірае як каталікоў, так і праваслаўных.

Думаем, што гэтак ставячы справу, ня мыляемся. Нашай мэтай ёсьць адрадзіць народ рэлігійна, культурна, эканамічна, грамадзка і палітычна. А гэта ўсё немагчыма, калі народ ня будзе мець сваёй народнай, суцэльнай ідэолёгіі, сваей вядучай да гэнай мэты праводнай думкі. БХД над гэтым працуе і працаваць не перастане.

Гісторыя ведае прыклады, калі адзін і той самы народ, падзелены рэлігіяй, у выніку цалком падзяліўся на ўласную шкоду. Гэтак сталася з сэрбамі і харватамі. Гэтак можа стацца і з беларусамі і да гэтага імкнуцца нашы ворагі, якія між іншым, углыбляючы рэлігійны падзел між беларусамі, падсоўваюць іх пад сьмяротны абух польскі і маскоўскі.

Не дапусьцім да гэтага — супольнымі беларускімі сіламі да супольнай беларускай мэты!...

Дзейнасьць Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў 1931 г.

Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры засноўваўся і распачаў сваю дзейнасьць на тэрыторыі Заход. Беларусі ў 1927 годзе.

Галоўныя мэты Б.І.Г. і К.: — падтрыманьне разьвіцьця: а) краёвага земляробства ўва ўсіх яго галінах, б) людовага промыслу, рамясла, тэхнікі і людовага мастацтва, г) пашыраньне і падтрымліваньне духовай культуры, навукі і прасьветы.

Дня 24 красавіка с. г., як мы ўжо падавалі ў прошлым нумары, адбыўся звычайны гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. На гэтым сходзе старшыня Інстытуту кс. В. Гадлеўскі здаў справаздачу з дзейнасьці гэтай культурна-прасьветна-гаспадарчай арганізацыі.

З справаздачы гэтай даведваемся, што Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры на тэрыторыі Зах. Беларусі мае 52 гурткі, у якіх гуртуецца звыш 700 сяброў. З гэтых 52 гурткоў: 36 гурткоў маюць бібліятэкі-чытальні, некаторыя аж па 800 кніжак.

Дзейнасьць Цэнтральнага Ураду Б.І.Г.і К. і яго фінансы.

З справаздачы даведваемся, што фінансы Інстытуту ў 1931 г. складаліся выключна з ахвяр сяброў Цэнтралі і правінцыянальных гурткоў. З больших ахвяр з падзякай была адзначана ахвяра кс. П. Татарыновіча, які на мэты Інстытуту ахвяраваў 100 зл.

Коштам гэных ахвяр Цэнтральны Урад Інстытуту ў 1931 г. утрымліваў адну прыватную беларускую школу ў Шаўлянах, Браслаўскага пав., якую наведвала 43 дзяцей; выдаў пры помачы беларускай друкарні ім. Фр. Скарыны 4 кніжкі:—„Новая Зямля" Якуба Коласа, творы Фр. Багушэвіча: — „Dudka biełaruskaja" і „Smyk biełaruski" разам з крытычным нарысам аб жыцьці і творчасьці поэта, напісаным кс. Ад. Станкевічам і „Pieršyja Łastaŭki" — сцэнічны абразок з беларускага жыцьця Беласточчыны, а так-жа выданы Інструкцыі і Рэгулямін, як закладаць і весьці гурткі Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Апрача гэтага ў прошлым годзе ўпарадкавана і скаталёгавана даволі цэнная бібліятэка пры Цэнтралі Інстытуту.

Дзейнасьць Інстытуту на правінцыі.

У 1931 годзе, падае справаздаўца кс. В. Гадлеўскі, віцэ-старшыня Цэнтр. Ураду Інстытуту — інж. А. Клімовіч даканаў люстрацыі 15 правінцыянальных гурткоў на тэрэне ваяводзтваў Навагрудзкага і Віленскага ў: Рубяжэвічах, Задвор'і, Гарадзішчы, Ляхавічах (2), Варанэмшчыне, Шутавічах (2), Расьле, Жодзішках, Юшкох, Мур.-Ашмянцы, Будславе, Адамчуках і Медніках і прачытаў на правінцыі 15 папулярных лекцыяў аб беларускай гаспадарцы і культуры. Агулам прафтычна рэфэратаў у гуртках Інстытуту ў 1931 годзе — 27. Тэатральных прадстаўленьняў правінцыяльныя гурткі Інстытуту зладзілі за год больш 30.

Цікава тут будзе азначыць, як падае справаздаўца, што адміністрацыйныя ўлады часта не давалі дазволу на ладжаньне такіх нявінных імпрэзаў, як тэатральныя прадстаўленьні і вечарыны.

З справаздачы даведваемся далей, што ў працягу 1931 году заложана 7 новых гурткоў Інстытуту ў пав.: Ашмянскім, Віл. Троцкім, Навагрудзкім, Бельскім і Браслаўскім і што адміністрацыйныя ўлады рабілі труднасьці так-жа і ў закладаньні новых гурткоў, асабліва ў Навагрудзкім ваяводзтве (Дзятлычы, Гайнія) і на рэкурсы Цэнтралі Інстытуту ў справе забароны, Навагрудзкі ваяводзкі Урад нават не адказвае. (Рэкурс у справе гуртка ў Гайніне быў высланы 8.X.31 і дагэтуль няма ніякага адказу). Падаваў так-жа Цэнтр. Урад Інстытуту ў Віленскае ваяводзтва просьбу аб дазвол зьбіраць ахвяры на Стыпэндыяльны Фонд для студэнтаў—беларусаў, але атрымаў адказ адмоўны.

У працы Інстытуту перашкаджалі так-жа і камуністы, якія або адцягвалі маласьведамых сяброў ад Інстытуту, або калі гэта ім не ўдавалася, ішлі на зрыў гуртка пры помачы правакацыі, падкідаючы сябром гуртка Інстытуту нелегальную літэратуру, або нават шлючы на сяброў Інстытуту тавую літэратуру поштай. Паліцыя даведвалася аб гэтым і ў рэзультаце праца ў гуртку прыпынялася. Так было ў Ашмянскім пав. у Сьвірыдавічах, у Вялейскім пав.—у Асінаўцы, у Маладэчанскім пав.—у Малой-Боркаўшчыне і інш.

Мэморыял Цэнтральным польскім уладам

Агульны сход Рады Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры, выслухаўшы справаздачу, пастанавіў падаць Цэнтральным польскім уладам у Варшаве мэморыял, у каторым апісаўшы ўсе перашкоды і несправядлівыя адносіны польскіх адміністрацыйных уладаў да культурна-прасьветнай працы гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, дамагацца справядлівасьці ў гэтых адносінах.

З гэтай справаздачы мы бачым, у якіх цяжкіх варунках знаходзіцца бадай адзіная культурна-прасьветна-гаспадарчая арганізацыя ў Зах. Беларусі і яе змаганьні з нашымамі прыдушэньня культурна-прасьветнай беларускай працы на сяле і адначасна жывучасьць беларускай народнай сьведамасьці ў імкненьні да арганізацыі, арганізаванай працы і любасьці да свайго роднага. А гэта ўсё пацьвярджае, што народ Беларускі не загіне.

П—к.

З газэт.

Махінацыі п. Р. Астроўскага.

На наш артыкул „Немагчыма!" у № 17 „Бел. Крыніцы", дзе было сказана паміж іншым, што „гешэфтмахер" і павадыр, побач з А. Луцкевічам, беларускага „полёнафільства" Р. Астроўскі пашырае чуткі, што быццам школьная ўлада зьбіраецца ліквідаваць апошнія дзьве беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі — Р. Астроўскі адказаў адкрытым лістом у „Kurjery Wilenskim" з 3 мая с. г. У сваім лісьце Р. Астроўскі даслоўна піша: „Гэтым канстатую, што на аснове гутаркаў, пераведзеных з п. Куратарам Віленскага Школьнага Вокругу я паведаміў публічна 17 красавіка сёлета прадстаўнікоў Бацькаўскага Камітэту Беларускае Гімназіі ў Вільні, што Віленскія школьныя ўлады *ня толькі ня імкнуцца да ліквідацыі нашых гімназіяў, але зусім наадварот — п. Куратар неаднойчы выказваў пагляд .. падымаючы думку аб магчымасьці поўнага забясьпечаньня гімназіі скарбам Дзяржавы.*" (Падч. наша — Рэд.).

Пашыраныя Р. Астроўскім весьці аб тым, што быццам школьная ўлада зьбіраецца ліквідаваць у Наваградку й Вільні беларускія гімназіі чулі не адны мы, чула іх амаль усё беларускае грамадзянства Вільні. Ды напасьледак, не адна „Бел. Крыніца" паўтарыла гэтыя чуткі: падала іх так-жа „Novaja Varta", орган корпарацыі „Скорынія", філістрам каторай ёсьць сам Р. Астроўскі. Розьніца ў дадзеным прыпадку паміж намі і „Novaj Vartaj" была тая, што мы ў такую вялікую крыўду не маглі паверыць, а гадунцы п. Р. Астроўскага — паверылі.

Але чаму Р. Астроўскі пашыраў чуткі, которым цяпер пярэча? Адказ той-жа, што мы далі ў мінулым нумары „Бел. Крыніцы" — жаданьне памсьціцца на Наваградзкай Гімназіі, зрабіць сябе адзіным, хто-б патрапіў „ўратаваць" Беларускую Гімназію ў Вільні і спэкуляваць на гэтым далей!

Праўдзівае аблічча п. Астроўскага паказана ўрэшце ў тым мейсцы ягонага ліста, дзе ён слова ў слова беліць сябе перад *польскім*(!) грамадзянствам — з беларускім грамадзянствам п. Р. А. мусіць „не рахуецца" — і польскімі ўладамі, выслугоўвуючы перад каторымі сабе „залатыя шпоры", ён „не брезгает" і звычайным даносам. Што пры гэтым „звіхнулася яму нага" і віну за аўторства нашай стацьці „Немагчыма" прыпісаў кс. Ад. Станкевічу, каторы пасьля забароны Віл. р.-к. арцыбіскупа аніякага ўчасьця ў нашай газэце ня прымае і каторы, як даведваемся, больш тыдня ў гэтым часе сусём ня быў нават у Вільні і ні аб чым гэтым ня ведаў, — п. Р. А. „не робѣет".

Пасьпех, з якім выступіў п. Р. А. з „папраўкай" у *польскай* прэсе, зьмест і форма гэтай папраўкі нічога не „прэстуюць", а наадварот — пацьвярджаюць, што наша стацьця „Немагчыма" наступіла п-ну А. на „мазоль", які ён сам сабе намуляў сваей „работай".

Сьцеражы Божа Беларускі народ ад гэтакіх, як Р. А. „абаронцаў", а ад непрыяцеляў ён — народ — сам абароніцца.

Дык беларусы павінны быць на варце сваіх гімназіяў.

Б.

З беларускага жыцьця.

З выдавецкай нівы. Гэтымі днямі вышла з друку і паступіла ў продаж новая кніжка аб гаспадарцы п. н. „Ziemlarobskaja čytanka", напісаная інж. А. Клімовічам; бачын 148, выданьне „Бел. Крыніцы," цана кніжкі 1 зл. Кніжка падае гаспадарчыя рады на цэлы год (вясна, лета, восень зіма) і павінна была-б быць у кожнага гаспадара, які зразумеў ужо, што сягоньня на сьлепа гаспадарыць нельга.

З пэрыодычнай прэсы варты асаблівай ўвагі месячнік беларускай моладзі „Шлях Моладзі" (м-ц Красавік 1932 г.) № 4. Зьмест цікавы і павучальны.

Вышаў таксама падвойны нумар (4—5) за м-цы красавік-травень с.г. беларускай рэлігійнай (уніяцкай) часопісі „Да злучэньня!" Зьмест выключна рэлігійны: толькі ці не за шмат карыстаецца рэдакцыя „Да злучэньня!" з супрацоўніства беларусоў — лацінынікаў?

— Усе беларускія выданьні можна купіць і выпісаць з беларускай кнігарні „Пагоня", Вільня, Завальная 6—10.

Немагчымасьць сужыцьця.

(*З студэнскага жыцьця*).

Беларускае студэнства ў Вільні мусіла ў гэтым годзе на сваіх плячох перанесьці цэлы рад udараў. Калі ў мінулыя гады нашае студэнства, сарганізаванае ў Беларускім Студэнскім Саюзе, магло нормальна працаваць і рабіць даволі вялікія крокі наперад, то сёлета гэтая праца ў значнай меры спынена тымі немагчымымі абставінамі, у якіх Саюз апынуўся. Гаворучы аб гэтых немагчымых абставінах, маю на думцы дзейнасьць полёнафільскай санацыйнай корпарацыі „Скорыніі" і яе палітычныя інсынуацыі, робленыя ўсьцяж пад адрэсам таго-ж Саюзу. Корпарацыя, паўстаўшая ў мэтах разьбіцьця адзінага дасюль фронту беларускае студэнскае моладзі, кіраваная закулісна праз сваіх „апякуноў" — філістраў — шырока ведамых полёнафілаў Луцкевіча і Астроўскага, адразу пачала змагацца з незалежнай думкай беларускага студэнства, імкнучыся да апанаваньня Саюзу. Ня буду тут пералічаць усіх тых фактаў, якія ілюстравалі іхнюю „работу" ў першай палавіне сёл. акад. году, бо аб гэтым шмат ужо гаварылася й пісалася ў прэсе, успомню толькі, што нашае студэнства дало належны адпор спробам уводжаньня праз „Скорынію" на грунт Саюзу нізкага палітыканства, шляхам прыняцьця на агульным сходзе 13.XII 31 г. пастановы, забараняючай сябром Саюзу належыць да „Скорыніі". Здавалася тады, што ўжо наступіць спакой у Саюзе, што аддзяліўшыся ў такі спосаб ад непажаданых гасьцей, можна будзе шляхам мінулых гадоў нормальна працаваць. Аднак не. Куратар Саюзу, праф. Владычка, ня лічучыся з воляю Саюзу, уняважніў успомненую пастанову з прычынаў фармальнага характару і некаторыя сябры „Скорыніі" пачалі ўзноў лічыцца сябрамі Саюзу. Прыпомніма, як яны ў той час былі засугэраваны сваім „трыумфам", з якім комфортам прыходзілі ў памешканьне Саюзу, што кожнаму рабілася прыкра ад іхняга дзікага дэманстрацыйнага захоўваньня. Аднак сябры Саюзу сьцярпелі даволі ціха ўсе манэўры „Скарынчыкаў", не протэставалі нат супроць таго, што ў гэты-ж Саюз, разам з іншымі прыходзілі і тыя сябры „Скорыніі", якія не зьяўляюцца зусім сябрамі Саюзу, а нават і „слаўны" мардабой „высокі коміліто́н" М. Маркевіч. Уся рэакцыя сяброў Саюзу агранічылася толькі да байкатаваньня сяброў „Скорыніі" і неподаваньня ім рукі.

„Скорынія", не задаволіўшыся гэтым сваім „трыумфам", правільна ўважаючы яго за часовы толькі, вядзе сваю разьбівальную работу далей у прысьпешаным тэмпе. Выходзіць № 2 „Novaje Varty" — афіцыяльнага органу „Скорыніі". У гэтым часапісе ад імя корпарацыі, хоць ня студэнт, але нейкім дзіўным чынам яе сябра, Я. Зянюк, знаны, як і М. Маркевіч, „мастер" кулачных расправаў, вульгарнымі славамі нападае на цэлы рад сяброў Саюзу, якіх уважае за найбольш небясьпечных для палітычных махінацыяў „Скорыніі". Вылаіўшыся, колькі мага і як на такога чалавека прыстала, ды пагразіўшы

W. A. 12)

Kaniok-Harbuniok.

IX.

Zaŭtra rana, pierad świetam,
Janka byŭ užo adzietym,
Na darohu apranutym
I pamytym i abutym.
Toje-sioje chap z saboju!
I pajechaŭ toj paroju.
Jeduć, jeduć biesprarуŭna;
A daroha wielmi dziŭna:
Hory, hory až da mora;
Toje-ž mora až hawora:
Kruhom chwali, chwali, chwali
Cieła mora kałychali.
Chwali tworać cełу wały,
Wały łučacca ŭ nawały;
Hety ž tworać cełу hory
I kłubiacca ŭ cełym mory,
Až pawierchu pieraskača.
Mora stohnie, mora płača,
Nia ścichaje na minutku,
Što až Janku stała žudka.
Bačyć Janka - pływie łodka,
A u łodca, jak sirotka,
Siadzić niejkaja dziacina.
Tolki hladź! ažno dziaŭčyna.
To była jakraz caryca —
Jana miesiacu siastryca.
Harbuniok — wialiki źwier!
Skok Iwanu za kaŭnier:
Tam kruciŭsia i kapaŭsia,
Až za pazuchu schawaŭsia.
Iwan tak-ža ahlaniecca,
Hdzie schawacca, hdzie padziecca
Nawakoła kinuŭ wokam,
Bačyć, kamień niedaloka;
A wialiki bieskaniečna!
„Wot tut budzie nam biaśpiečna."
Harbuńku naš Janka kaža
I za kamień cicha łaža.
Łodka bližaj padpływaje.
Dzieŭka z łodki wylazaje,
Nawakoła wokam wodzić
I da kamienia padchodzić.
Sieła, cicha zapiajała;
Huśli ručkaju trymała:
Zaihrała tak pryhoža —
Janka wytrywać nia moža,
Toj muzyki słuchaŭ, słuchaŭ
I čuprynu sabie čuchaŭ.
Taja-ž pieśnia tak lijecca,
Jak wada ŭ spakojnaj rečca:
Pływuć tony roŭna, zhodna,
Źwiniać struny pačarodna;
Abo časam dźwie zazwoniać,
Sonam wostrym zahamoniać;
Uznoŭ pieśnia pływie strojna,
Cicha-cichańka, spakojna.
Časam ŭletku tak bywaje:
Ŭsia pryroda zamiraje;
Pracawity dzień zmaryŭsia
I da wiečara schiliŭ ia.
Praz dzień sonca napacieła,
Až pad wiečar ščyrwanieła:
Świecić miakka i łaskawa;
Spać idzie, adnak cikawa —
Jašče ŭ lustra hlanuć choča,
Łučom rečańku łaskoča;
Wiecier šelmu prahaniaje,
Samo hraje... Sonca hraje!
I nia moža nahladziecca,
Až kupajecca u rečca!
Dy woś zara mleje, mleje —
Naša soniejka słabieje;
I świacić užo nia moža
I samo nia tak pryhoža...
Šelma-wiecier tut sarwaŭsia,
Što pierš soniejka bajaŭsia,
Skałmaciŭ wadu, papsociŭ,
Woblik soniejka zmarkociŭ.
Sonca nosam zakiwała
I zasnuła, jak dramała.
Miesiac dumaŭ, što patreba,
Paskrabaŭsia sam na nieba.
A zabraŭšysia wysoka,
Raščyniŭ wialika woka
I jon ŭ rečku pahladaje,
A čaho? i sam nie znaje!
Dumaŭ — dureŭ, što charošy...
Cha, jak lulka za try hrošy!
Dyj paznaŭšy, zastydaŭsia,
Ŭziaŭ za chmaru, dyj schawaŭsia...

X.

Janka śpić, a Konik chodzić.
Janka ŭstaŭ, dyj wokam wodzić;
Dyj pytaje: „Što tut stała?
Hdzie careŭna?" — „Nie čakała!"
Kaža Konik: „My praspali!"
Huśli nas ačarawali:
Sama taja Car-dziawica,
Vidać, dobra čaraŭnica!
I my — dobryja raziawy!
Ŭ paławinie ważnaj sprawy
Spać sabie tut zachacieli,
Jak u chacie, u paścieli...
Ja dyk chutka prabudziŭsia,
Kruhom hlanuŭ, až ździwiŭsia:
Niamа našaje dziaŭčyny!
„Ech, dubiny my, dubiny!"
Kaža Janka: „Što ž rabici?
Car carycy nie złаwici —
Jak mnie z kniaziem raščytacca,
Jak z hałoŭkaj skwitawacca?"
Kaniok kaža: „Cicha, cicha!
Paławina jašče licha:
Ja woś baču — sprawa peŭna —
Zaŭtra wierniecca careŭna:
„Hej, Kaniok, adkul ty znaješ?
Tolki darma mnie bałtaješ!"
„A ty, Janka, nie spračajsia:
Uważaj, dy pryhladajsia.
Bačyš, huśli astalisia?"
„A jany adkul ŭzialisia?"
Tut Kaniok jamu tłumačyć,
Što jakraz woś hetak značyć,
Car-carycca ich zabyła,
Ci schawała, ci zhubiła;
Dyk woś zaŭtra ŭznoŭ pryjedzie
Choć ciapier na mory niehdzie.
Tolki čur! kab nie praspaci —
Treba dobra pilnawaci.
Woś-ža huśli prychawali,
Sami dobra pilnawali,
Až źjawiłasia careŭna,
Niejka sumna i niapeŭna;
Uzdychała, narakała,
Swaich huślaŭ jak šukała.
Dyk woś Janka kali skoča,
Dy ŭciakać careŭna choča;
Nie paśpieła čarawaci.
Janka tut jaje i chwacie,
I na Konika siadaje,
Car-dziawicu zabiraje.
Jeduć, jeduć u stalicu;
Wiazie Janka Car-carycu.

(*d. b.*)

Саюзу яго ліквідацыяй, Я. Зянюк заклікае да „маральнага разбраеньня". Вось тут, дык якраз папаў пальцам у неба, бо хто-ж сумляваецца яшчэ сяньня, што аўтор стацьці не разброіўся маральна? Гэта рэчаісты факт. Але іншыя якраз хочуць быць маральна ўзброенымі і гэтакімі будуць заўсёды. Таксама ў хроніцы „N. V." поўна ніскай лаянкі на сяброў Саюзу, няпрыстойнай нат годнасьці акадэміка.

Дык ці-ж магчымае ў такім прыпадку нейкае таварыскае сужыцьцё з „Скорыніяй", аб якім так часта яны гавораць? Там, дзе адзіным заданьнем ёсьць, у імя сваіх „хлебадаўцаў", уводжаньне палітыканскае грызьні і драбленьня, а адзіным рэгулятарам усякага гонару — кулак безадказных адзінак, — ясна, што ніякае мовы аб таварыскім сужыцьці быць ня можа.

Калі адпадае пункт таварыскі, дык можа магчымым ёсьць пункт грамадзкі; можа, памінаючы ўсе справы меншае вагі, можна знайсьці нейкі modus vivendi на грунце працы для дабра агульна-роднае справы? Прыгледзьмася ж, як „Скорынія" для справаў адраджэньня беларускага народу працуе. Не ўспамінаючы аб многіх праявах гэтае „працы", на што не хапіла-б тут месца, я спынюся толькі на № 2 „Novaje Varty", дзе карпарацыя абвесьціла sui generis сваю ідэёвую дэкларацыю. Вось у перадавіцы заклікае беларускі народ вырачыся яго соцыяльна-нацыянальных імкненьняў, а прыступіць да тварэньня беларускага позытывізму. Вельмі добра. Але пабачым далей, што гэта за „позытывізм", на якіх асновах, у разуменьні пісакаў „N. V.", ён грунтуецца? Ламаць галаву доўга ня прыходзіцца, бо зараз-жа ў часопісі знаходзім вычэрпуючы адказ. І так Г. Багдановіч у артыкуле „Наш спорт", констатуючы факт, што няма беларускіх спартовых арганізацыяў, прыходзе да вываду, што замест тварыць іх, *трэба йсьці ў польскія спартовыя арганізацыі*! Дзякуем за раду. За такія парады й грошыкі плацяцца. І хіба-ж на падставе гэтага „позытывізму" адзін з фуксаў „Скорыніі" закладаў(!) на правіцы „Strzelców". У другім мейсцы „Скарычыкі", льючы кракадылавы сьлёзы над пагрозаю ліквідацыі польскімі ўладамі дзьвюх апошніх беларускіх гімназіяў, заяўляюць, што *ў гэтым ліквідацыйным імкненьні не паносяць віны ўрадавыя колы, але.. розныя Грабскія*. Гэта знача — ліквідуйце, паночкі, нашыя апошнія школы, а мы самі віну ўзложым на няіснуючых Грабскіх і ўсё будзе ў парадку. Значыцца ў той час, калі трэба сабраць усе сілы дзеля агульнага голасу пратэсту перад прыгатаўляным сьмяротным ударам па беларускаму народу,— „Скорынія" сама гэты-ж удар прыгатаўляць памагае. Як такая дзейнасьць у разуменьні грамадзкім называецца, — лёгка дадумаюцца нашыя чытачы... ёсьць людзі, што за грошыкі гатовы забіць роднага бацьку...

Дык ці пасьля ўсяго гэтага магчымым ёсьць нейкае сужыцьцё нашага студэнства з „Скарыніяй"? Ясна, што не! Над гэтым трэба раз на заўсёды паставіць крыжык і, паміма розных перашкодаў, вытрываць да канца. Нашае студэнства, надзея ўсяго народу, будучыя кіраўнікі агульна-народнай справы, ня можа зьмясьціцца пад адным дахам з корпарацыяй „Скорынія". Гэта ясна,— як Божы дзень!

Былы студэнт.

З Польшчы.

Чарговая конфэрэнцыя б. прэм'ераў санацыйных урадаў адбылася 26 красавіка с. г. Конфэрэнцыя гэта адбылася пад старшынством прэзыдэнта Масьціскага. Найбольшай несьпадзеўкай зьяўляецца, што марш. Пілсудзкі на гэту конфэрэнцыю не зьявіўся. Аб чым там гаварылі, ўсё астаецца сакрэтам.

Сьвята працы 1 траўня ў Польшчы прайшло ня зусім спакойна. У Варшаве між паходам рэвал. фракцыі П.П.С. і камуністамі дайшло да стычак. Дэманстранты ў сутычках пачалі нават стрэляніну. У выніку арыштавана каля 100 асоб.

У Сасноўскім прамысловым раёне дэманстранты стралялі ў паліцыю, а паліцыя бароннячыся страляла ў дэманстрантаў. У выніку дзьве асобы забітыя і некалькі ранена, між катарымі і некалькі паліцэйскіх.

Не этнографічная маса, а народ!

Польшча, заняўшы прастор этнографічнай Беларусі — Зах. Беларусь, бачыла тутака ня сьведамую народную адзінку (суб'ект), а толькі „этнографічную масу," з якой лёгка можна зрабіць палякоў. Колішні польскі старшыня міністраў — Скульскі вызначыў нават тэрмін, за які мае быць пераробленa „этнографічная маса" Зах. Беларусі на народ польскі. Скульскі тады заявіў, што за 50 гадоў ня будзе ў граніцах Польшчы (у Зах. Беларусі) аніводнага беларуса.

Ад таго часу, калі прадстаўнік Польшчы выявіў імкненьне польскай палітыкі ў адносінах да беларусаў, дзеліць нас добрых дзесяць гадоў. Гэты час паказвае нам, што імкненьні польскага нацыяналізму перарабіць „этнографічную масу" Зах. Беларусі на народ польскі, апрача натугаў—нічога больш не дакавалі. — „Этнографічная маса" Зах. Беларусі за гэты час, пад напорам гэтых натугаў польскага нацыяналізму, яшчэ больш усьведамілася нацыянальна і пачынае крысталізаваць сваю народна-беларускую ідэолёгію. Аб гэтым сьведчаць наступныя факты.

Наша рэдакцыя атрымлівае з усіх куткоў Зах. Беларусі: пісьмы, карэспандэнцыі ў газэту і розныя іншыя весткі, пісаныя пераважна сялянамі. Гэтыя карэспандэнцыі часта ня маюць літэратурнай „аглады" і дзеля таго ня могуць быць выкарыстаны ў друку. Але думка гэтых народных твораў (!) вельмі выразная. Для прыкладу і ашчаднасьці мейсца ніжэй зьмяшчаем толькі некалькі гэткіх адрыўкаў. Адзін з нашых карэспандэнтаў з Ваўкавышчыны піша гэтак:

„Беларусь, мой родны край,
Яе традыцыі, звычаі —
Усё бачу, што роднае,
Усё так бліска—дарагое.
У шчасьці сэрца тады б'ецца,
Душа ад радасьці сьмяецца
Ды дух надзею надае:
Наш край не загіне, бо народ жыве!"

——

„Беларусь, як калідор
Праз Савецкі доўгі двор,
Дык ахвотнікаў і ў Польшчы
Не бракуе да гэтай плошчы.
Нецярпліваяцца й Саветы,
Свае пэўне-ж маюць мэты,
Хочуць зайцаў двух забіць,
Сябе ўзбагаціць, а нас здушыць."

——

„Прыходзіць час, пара гаварыць,
Хай кожны з нас рахунак зробіць,
Што ён рабіў, чаго жадае
І што здабыць на мэце мае.
Як і што рабіць — „Крыніца" скажа
Ды растлумачыць і пакажа."

——

„Добра воля, думкі, чын
Апраўдаюць тв й пачын.
Дык браточкі, пасьпяшайце!
„Бел. Крыніцу" пашырайце,
Гурткі родны закладайце,
У свой банк грошы хавайце
Ды аб школах памятайце:
У роднай мове вымагайце,
Бо ж аб сабе вам трэба дбаць
І незалежнасьць будаваць."

——

„Дзіўны справы ёсьць на сьвеце:
У касьцеле польшчаць нашы дзеці.
Кажуць ў чужой мове Бога маліць,
Абы толькі сабе дагадзіць.
Нашы дзеці ад ксяндзоў грахі хаваюць,
Бо папольску спавядаюць.
Роднай школы бацькі просяць
Дэкларацыяў вагон наносяць
Кніжак родных, кніжачак нам
Кніжачак просім, кніжак чакаем.
Каб веду павышыць і яе пашырыць
Кніжачак родных мы мусім здабыць."

——

„Цябе, Беларусь, люблю
Табою толькі я жыву,
Усе думкі, праца для Цябе —
Гэтым самым дбаю аб сабе."

Гэта так сягоньня думаюць і такія ставяць дамаганьні не павадыры народна-беларускага адраджэнскага руху, а „этнографічная маса" Зах. Беларусі, якую Скульскі запавядаў праз 50 гадоў ператварыць на народ польскі, а Б.Б—экі хочуць дзяліць на рэгіёны, не прызнаючы беларусаў за народ, а толькі за этнографічную масу, якая паводле іх думкі, можа лёгка ператварыцца і ў палякоў.

Што гэткі пагляд Б.Б-экаў памылковы, таксама як і цьверджаньне Скульскага, пацьвярджае вось і гэтая, адна з многіх, карэспандэнцыя з Ашмянскага пав. прысланая ў нашу рэдакцыю гэтымі днямі.

„У Ашмянскім пав., каля нас, усільна стараюцца пашыраць па вёсках польскія арганізацыі: „стральца" і розныя іншыя „колы." Беларуская моладзь ад польскіх арганізацыяў адпапыраецца і ў гэтыя „кулкі" ня йдзе. Калі дзе хто запішацца ў гэтыя арганізацыі, дык тады таго ўся моладзь байкатуе і часта здараюцца выпадкі, што такім „стральцом" і „кулковічам" робяць г. зв. „цёмнуюноч": — зловяць такога ягомосьця, накінуць каптан на галаву і „адшпараць" прутамі па іншых часьцінах цела, а найбольш, каб помніў, як будзе сядаць.

Пэўне ж, гэткі спосаб змаганьня ня добры, але наша моладзь інакш ня ўмее, бо ня мае дзе вучыцца культурнага змаганьня і ня мае сваей беларускай арганізацыі, у якой-бы аб'ядналася і лучылася. Дык трэба дамагацца сваей роднай беларускай арганізацыі, бо без яе моладзь ходзіць самапасам і часта блудзіць."

З Дзісеншчыны, Вялейшчыны, Навагрудчыны, Баранавіччыны і інш. мясцоў узноў паведамляюць нас, што і самі тамтэйшыя польскія заправілы ўжо зразумелі, што да душы нашага народу, нашай моладзі можна прагаварыць толькі пабеларуску. Дзеля гэтага напр. усякія „Стшэльцы" і „Стоважышэньні", нават і асаднікі ўсюды і скрось заманіваюць да сябе нашу моладзь беларускімі (па форме — не па зьместу) прадстаўленьнямі. А з успомненай Ашмяншчыны ведамы нам „жалі" аднаго з тамтэйшых польскіх арганізатараў на беларускую моладзь, якая на прапазыцыю ўступіць у польскія арганізацыі перадусім „дамагаецца Беларусі".

З вышсказанага ясна, што беларускі народ ня ёсьць толькі „этнографічнай масай," якую можна перарабіць на палякоў, а ёсьць жывым народам, які мае і свае народныя мэты і які бароніцца, як умее, ад „перарробкі" яго на іншы лад. А дзеля гэтага трэба і адносіны да беларускага народу абапёрці не як да „этнографічнай масы," а як да народу, які мае ўсе правы да жыцьця

Д—р.

З краю.

У Вільні сьвята працы 1 траўня прайшло спакойна. Былі наладжаны толькі два паходы: казённых Б. Б-каў і апазыцыйных П. П. С аў, да якіх далучыліся і жыдоўскія работніцкія саюзы. Камуністы сёлета ня здолелі нават і паказацца на вуліцу.

На правінцыі ва ўсім краю сьвята працы адбылося зусім незаметна.

Арышты. Апошнімі днямі прад 1 траўням ў пав.: Сьвянцянскім, Вялейскім і Маладэчанскім паліцыя дакавала арыштаў западозраных у камунізьме асоб.

Вешаюць. Палявы (даразны) суд у Лідзе дн. 26.IV. с. г. засудзіў на кару сьмерці І. Грубача і М. Чэховіча. Засуджаных 27.IV нараніцы павесілі.

Сыльв. Воевудзкі расстраляны.

Ведамы ў нашым краю, як адзін з павадыроў б. польскай партыі „Wyzwaleńnia" С. Воевудзкі месяцы два таму ў Саветах расстраляны. Разам з Воевудзкім бальшавікі растралялі і ягоную жонку.

Воевудзкі сярод беларусаў ведамы тым, што ён сьпярша працаваў у II аддзеле польскага ген. штабу, быў вялікім прыяцелем Антона Луцкевіча і надта глыбака ведаў аб усім, што рабілася ў „Грамадзе." Прад выездам у Расею Воевудзкі выяўляў сябе як камуніст. У чым западозрылі яго камуністы, пакульшто сакрэт.

З заграніцы.

Наступная конфэрэнцыя дзяржаў. Лёнданская конфэрэнцыя, якая адбылася ў справе ствярэньня блёку наддунайскіх дзяржаў, пашырыла думку Францыі ў гэтай справе і заініцыявала склікаць конфэрэнцыю дзяржаў Усходняй Эўропы. У гэтай конфэрэнцыі маюць узяць учасьце апрача: Францыі, Англіі, Нямеччыны і Італіі,—так-жа: Баўгарыя, Турцыя і Грэцыя. Конфэрэнцыя мае радзіць ня толькі аб спосабах ратунку наддунайскіх дзяржаў ад фінансавай катастрофы, але агулам над праблемай военных даўгоў і адшкадаваньняў.

Конфэрэнцыя гэта, калі зацікаўленыя дзяржавы дойдуць да ладу, мае быць склікана не раней, як у чэрвені с. г. Пакульшто аб гэтым у міжнароднай палітыцы Эўропы маўчаць, бо ўсе эўрапэйскія дзяржавы прыглядаюцца і прыслухоўваюцца да парляманцкіх выбараў у Францыі, якія цяпер там адбываюцца.

Парляманцкія выбары ў Францыі пачаліся ў нядзелю 1 траўня і закончацца ў нядзелю 8 траўня. Паводле першага галасаваньня 1 траўня, Францыя пасунулася ў лева. Партыі лявіцы ва ўсей Францыі перамагаюць.

На Далёкім Усходзе ўсьцяж напады, узрывы і забурэньні. Надовячы ў Шанхаю, пад час дэфіляды японскага войска, малады карэйчык (незалежнік) кінуў бомбу ў таўпу генэраліцыі, якая прымала дэфіляду войска. Узарваўшаяся бомба сьмяротна скалечыла некалькіх генэралаў японскага войска і прадстаўнікоў японскай дыплёмацыі. У Манджурыі гэтымі днямі паўстанцы збурылі часьць Усходня-Кітайскай чыгункі. Паўстанцы напалі ў другім мейсцы на цягнік. Словам, на Далёкім Усходзе ўсё катлуецца.

Hutarka Dziadźki Haŭryły.

Daraženkija čytačy! Užo treci raz hawaru da Was praz hazetu. Moža Wam maja hutarka nie padabajecca, dyk pišecie ŭ hazetu krytyku. Pišecie swaje ŭwahi, za heta budu Wam udziačny.

Siańnia chaču pramowić da maładych čytačoŭ. Darahi bratok, pasłuchaj što ja Tabie skažu i to nie na wucha, bo heta nie sakret.

Jak wiedama, končyŭsia post, prajšoŭ Wialikdzień, nu a pa Wialikadni mohuć być i wiečarynki. U nas na Biełarusi hetyja wiečarynki časta bywajuć nie takimi, jakich moładzi našaj treba Časta i husta moładź apošni hroš addaje na harełku. „Wiesialej budzie hulacca"— kaža nie adzin i pjeć za apošni krywawa zarobleny hroš.

Ci hetyja słowy „wiesialej budzie hulacca" majuć padstawu? Praŭda, ad harełki chwilinu pahulaješ wiesialej, ale nia hetulki budzieš wiesialicca, kolki durnieć. Ci-ž mała čuješ, darahi čytač, jak u adnym miejscy pabilisia, a ŭ druhim złamali ruku, u inšym raščapili haławu i h.d. Nie mahu ŭsiaho ŭspaminać, bo robicca žudasna. Ci-ž heta nie durnata, što brat brata zabiwaje? A chto-ž dajeć hetu durnatu? Harełka, daraženki, harełka!

Dyk pasłuchaj mianie staroha, daraženki čytač. Kali pješ harełku, dyk kiń ad siańniašniaha dnia, bo harełka Twoj worah — adbiraje zdaroŭje maročyć razum i daje durnatu ŭ haławu.

Ci-ž nia lepiej na wiečarynie hulać z zdarowym i ćwiordym rozumam? Za hetyja hrošy, što aščadziš ad harełki, kupi knižak, wypišy hazetu, dyk budzieš mieć nia tolki pryjemnašć, ale i karyść i nia budzieš prazywany „ciomnym chamam", jak majuć modu zwać nas napływowyja palaki.

A ciapier jašče adno — heta pradstaŭleńni pierad wiečarynkaj; ale kab doŭhaj hutarkaj nia nudzić Ciabie, darahi čytač, ab hetym pahaworym u „Bieł. Krynicy" za paru tydniaŭ.

Dziadźka *Haŭryła.*

„BLACHA CYNKAWAJA"! Biuro pradažy polskich walcoŭniaŭ cynku, S-ka z a.p. žadajučy dastasawać canu cynkawaj blachi na nadychodziačy budaŭlany sezon da materjalnaha pałažeńnia nasielnictwa, abnižyła z dn. 1 krasawika sioł' hodu canu cynkawaj blachi z zł. 1.041.50 za tonu na zł. 954.50, inakš kažučy abnižyła na 87 zł. na tonie.

Da nas pišuć.

BABINCOWAJA PALITYKA.

Subotniki, Lidzkaha paw. Mudraja reč palityka, kali jana prawodzicca razumna i česna. Ale adzin anhielski palityk skazaŭ, što ŭ palitycy česnaści niama, a ŭkrainskija sialanie ŭ 1918 hodzie, hledziačy na balšawikoŭ kazali: „po kacapśki to ce połytyka, a po našemu to ce worowstwo." Jak našu Subotnickuju palityku akreślić, niachaj čytač sam padumaje, a ja jaje nazywaju palitykaj babincowaj, bo jana z bacincu wychodzić i ab babincy palitykuje. A wyhladaje jana woś tak:

Našy parafijanie daŭno ŭžo starajucca, kab z našaj parafii wybraŭsia sučasny probašč ks. T. Žebroŭski. U hetaj sprawie mnoha padana biskupu „padańniaŭ" z podpisami parafijanaŭ. Toje, ab čym pisałasia ŭ hetych „padańniach", wiedajuć nawat i staryja babulki, a tym bolš — maładzicy.

Apošnimi časami razyšlisia čutki pa ŭsiej parafii, što hołas narodu staŭsia čutny i ŭ biskupstwie, adkul pryšoŭ ks T Žebroŭskamu zahad wybracca z Subotnik i pierajechać byccam u Wišniewa kala Bahdanawa. Mužčyny ŭzradawalisia, babulki skazali „dziakuj Bohu", moładź wyjawiła swoj indyferentyzm, a maładzicy pačali „šušukacca." Ad hetaha „šušukańnia" maładzic zakruciłasia ŭ babincy palityka, jakaja papaŭzła i ŭ wioski. Źjawiŭsia, niawiedama adkul, niejki padarožny, jaki pačaŭ chadzić pa Subotnickaj parafii, načujučy adnu noč u adnej wioscy, druhuju ŭ druhoj i h. d. Hety padarožny ŭsiudy zajaŭlaŭ, što jon z Wišniewa i nadta narakaŭ na Wišnieŭskaha probašča, jaki byccam maje pierajechać u Subotniki na miejsca ks. T. Žebroŭskaha. Takim čynam pašła pa parafii ahitacyja praciŭ pryjezdu ŭ Subotniki probašča z Wišniewa, a hetym samym pačałasia ahitacyja za ks. T. Žebroŭskaha, jaki nia maje achwoty wyjaždžać z Subotnik.—Nie pamahła adnak babincowaja palityka ks. Žebroŭskamu, bo jon ad nas usiož tyki wyjaždžaje.

N a h l a d č y k.

REWIZIJA NA WIALIKDZIEŃ.

Jakužy, Brasłaŭskaha paw. Wialikdzień — najbolšaje światа dla kožnaha chryścijanina. U hety dzień ludcy zabywajucca ab usim, što ich hnybić: usie światkujuć, wiesialacca i Boha sławiać Adnym tolki Lawonpolskim palicyjantam niama świata. Pryjechali jany sioleta na Wialikdzień u našu wiosku i dawaj rabić rewiziju. Žudasna było hladzieć, jak u chacie palicyja rabiła rewiziju, haspadynia płakała, a pad waknom, starym našym biełaruskim zwyčajem, pazdraŭlajuć łałaŭniki (alelujščyki), piajučy Alleluja i biełaruskuju narodnuju wialikodnuju pieśniu — „Chrystos' dy kančajučy oracyjaj:

Kab tabie haspadar dobra žyłosia
U zdaroŭi i dzietkach wiałosia
Kab twaja skacinka waŭku ŭ zuby nie padałasia
I kab da noh twaich lipučaja hlina nie čapałasia.

S t u d e n t.

Wypiswajcie kataloh biełaruskich knih: a z jaho abaznačanyja čyrwonym atramantam

knižki pa tannaj canie!

Biełaruskaja Kniharnia „P a h o n i a"
Wilnia, Zawalnaja wul. Nr. 6.

АПАМЯТАЛІСЯ.

Азараны, Ваўкавыскага пав. Нядаўна па хатах нашае вёскі хадзілі польскія агітатары і загадвалі галасаваць на „адзінку". — Дзівіліся мы вельмі гэтаму, што і нашы галасы патрэбны, каб ратаваць Польшчу ад крызысу і ад безрабоцьця.—Але на другі раз дык пастараемся падтрымаць сябе і будзем галасаваць за сваіх.

А з а р а н е ц.

НЯ ЙДУЦЬ У ПОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ.

Ваўкавыск. 22 сакавіка ў нашым месьце адбыліся ў салі кіна „Polonja" закладзіны новатвора — „Stowarzyszenie rezerwistów i byłych wojskowych" места Ваўкавыска. Прысутных было некалькі беспрацоўных, якія загадзя атрымалі картачкі, (некаторыя думалі, што на дармовае прадстаўленьне) каб безпраменна зьявіліся. Калі-ж далі падпісываць дэклярацыі, дык прысутныя паказалі пяты. Ходзяць чуткі, што гэта арганізуюць такі „Związek" — каб разсылаць сяброў па дварох як парабкоў, дзе будуць ім плаціць па 50 грошай у дзень, даваць казённую адзежу і яду.

Б.

—§—

ЛІЦЫТАЦЫІ ФАЛЬВАРКАЎ.

Усё што мае якую вартасьць матэрыяльную цяпер загрожана ліцытацыяй. Драбнейшая маемасьць паддаецца пад ліцытацыю за падаткі і прыватныя даўгі каротка тэрміновых пазык, буйнейшая маемасьць у цэлым краю пагалоўна выстаўляецца на ліцытацыю за доўга-тэрміновыя даўгі банковыя.

Апошнімі часамі Віленскі Зямельны Банк абвесьціў ліцытацыю тысячны лік рознага роду гаспадарак: на пакрыцьце банковага доўгу.

Ліцытацыі маюць адбыцца 30.V і 22.VI. сёл. году.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!

Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!

ЛІТОЎСКАЕ НАВУКОВАЕ Т-ВА Ў ВІЛЬНІ,
заснаванае 7 красавіка 1917 году, склікае на 7—8 траўня сёл. г.

Урачысты Агульны Сход сяброў Т-ва

і гэтым паведамляе ўсіх сваіх прыяцеляў і сымпатыкаў.

Сход адбудзецца ў салі Гімназіі ім. Вітаўта Вялікага ў Вільні—вул. Домброўскага 5, дня 7.V. а гадзіне 19, а 8.V. а гадзіне 16.

Старшыня Т-ва (—) **М. Шыксніс.**

Pawodle sprawazdačy Instytutu dośledaŭ žaleza i stali ŭ Londynie, irža niščyć u praciahu hodu na ŭsim swiecie 400 MILJONAU TON ŻALEZA.

Cynk nie ržawieje!

KRYJ CHATU CYSTAJ CYNKAWAJ BLACHAJ!

„BLACHA CYNKOWAJA": Biuro pradažy polskich walcoŭniaŭ cynku S z a.p.
KATOWICE, Marjacka 11. Tel. 12-61.
Usialakija wyjaśnieńni i techničnyja instrukcyi daje biaspłatna.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.